## Кнігі знакамітай бібліятэкі Храптовічаў і ўнікальную перапіску XIX стагоддзя пакажуць у Мінску

# ФАЛІЯНТЫ ЧАКАЮЦЬ СУСТРЭЧЫ

**Выстаўка «Кнігазбор Храптовічаў: на шляху вяртання» адкрыецца 15 красавіка ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.**

Арганізатары паведамілі, што ў Музеі кнігі бібліятэкі ўпершыню будуць прадстаўлены ўнікальныя экспанаты: перапіска XIX стагоддзя сям'і Храптовічаў і вернутыя з-за мяжы кнігі з іх знакамітай бібліятэкі ў Шчорсах.

«Тры кнігі і перапіска прадстаўнікоў роду Храптовічаў былі вернутыя ў Беларусь з Германіі ў лютым 2020 года і з таго часу захоўваліся ў Нацыянальнай бібліятэцы. Вяртанне адбывалася намаганнямі дабрачыннага фонду «Шчорсы і Храптовічы». Некалі бібліятэка, якую пачынаў збіраць канцлер Іаахім Літавора Храптовіч у XVIII стагоддзі, лічылася адной з найбагацейшых ва Усходняй Еўропе», — паведамляе БЕЛТА.

«Як старажытныя кнігі, так і перапіска на французскай мове з'яўляюцца надзвычай каштоўнымі помнікамі свайго часу, якія да гэтай пары нідзе не публікаваліся і не дэманстраваліся шырокай публіцы. У мінулым годзе са згоды апошніх уладальнікаў выяўленыя каштоўныя дакументы былі перададзеныя ў Беларусь».

region.grodno.by



*Будынак бібліятэкі Храптовічаў у Шчорсах.*

Падчас адкрыцця выстаўкі адбудзецца афіцыйная перадача кніг і перапіскі Храптовічаў на захаванне ў Нацыянальную бібліятэку.

Акрамя гэтага, прадстаўнікі НББ і дабрачыннага фонду раскажуць пра першы вопыт даследавання кніг і перапіскі Храптовічаў, звернуць увагу на іх значэнне для беларускай і сусветнай культуры, а таксама распавядуць аб новых кроках па вывучэнні гісторыі славутага роду, яго спадчыны ў Беларусі і за мяжой.

Таксама ў экспазіцыі будуць прадстаўлены мастацкія творы студэнтаў БНТУ, якія працавалі валанцёрамі ў летніх лагерах па добраўпарадкаванні маёнтка Храптовічаў у Шчорсах у 2018—2019 гадах.